ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

'91

ЧАЦВЕР
4
КРАСАВІКА
№ 9(1673)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

## ЧЫРВОНЫ РАДОК

*Новае падраздзяленне дзейнічае ў нашым універсітэце з пачатку бягучага года — навукова-даследчая лабараторыя спектраскапіі пры кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі. Тое, як фармулюецца асноўны навуковы напрамак работы НДЛ, стварае ўражанне, што яе супрацоўнікі займаюцца чымсьці надзвычай цікавым і карысным. Набярыце паветра ў лёгкія і паспрабуйце прачытаць: даследаванне аптычных і спектраскапічных уласцівасцей дынамічных структур піра- і пьезаэлектрычных асяроддзяў і іх кампазіцый, стварэнне на іх аснове макетаў дэтэктараў аптычных сігналаў. Вось так!*

* * *

*Ні на месяц не спыніліся ў гэтым навучальным годзе замежныя паездкі па абмену вопытам супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта. Сакавік не выключэнне. 12.03 накіравалася ў Японію для ўдзелу ў пасяджэнні фізічнага таварыства гэтай краіны і для правядзення сумеснай навукова-даследчай работы загадчык лабараторыі НДІ ЯП Ірына Якаўлеўна ДУБОЎСКАЯ.*

*Таксама, як яна, два месяцы, толькі ў польскім горадзе Любліне, правядзе камандзіроўку дацэнт кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва юрфака Аляксандр Яўгенавіч ВАШКЕВІЧ.*

## Шапенгауэра набылі?

28 сакавіка ў галоўным корпусе універсітэта быў арганізаваны продаж кніг з серыі сусветнай культуры, што з'явіліся ў выдавецтве «Глобус» АН БССР. Іх аўтары — папулярныя ў Еўропе філосафы, якія ў нашай краіне раней не выдаваліся. Пакупнікам былі прапанаваны творы А. Шапенгауэра ў двухтомніку «Афарызмы жыццёвай мудрасці» (кошт 7 рублёў) і С. Кьеркегора — «Страх і трапятанне» (2,5 рубля).

— Ну як, купляюць? — пытаюся ў маладога хлопца-прадаўца.

— Купляюць. Але калі б разгарнуць продаж у корпусе, дзе вучацца будучыя філосафы, ахвотнікаў папоўніць уласную бібліятэку, напэўна, было б больш...

Плануецца, што частка грошай, атрыманых ад продажу філасофскіх прац, пойдзе на далейшае развіццё кнігавыдавецтва, у тым ліку твораў славутых пісьменнікаў і філосафаў. Значыць, кнігапродаж ва універсітэце не быў апошнім. Тым, хто не трапіў на яго, раю больш пільна сачыць за аб'явамі і пазбягаць адчаю.

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ.



Таццяна ЕЛІСЕЕВА — будучы матэматык. Але на гэтым фотаздымку яна, здаецца, больш нагадвае артыстычную асобу, чым уладальніка цвёрдай логікі. Гэта нездарма: адно з самых моцных захапленняў студэнткі другога курса механіка-матэматычнага факультэта — ігра на фартэпіяна.

Фота А. ГУСАКА.

## ВІНШУЕМ

## ПЕРАМАГЛА ГЕАГРАФІЯ

Нарэшце дайшла чарга і да геаграфіі. З гэтага навучальнага года яна ўключана ў праграму школьных алімпіяд. Ёсць ужо пераможцы раённых і абласных спаборніцтваў, якія на мінулым тыдні змагаліся за першынство ў рэспубліцы.

29 сакавіка, на закрыцці першай рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў па геаграфіі, якая праходзіла на геаграфічным факультэце БДУ, былі названы і ўзнагароджаны лепшыя з 63 прэтэндэнтаў. Шасцёра з іх — вучні 11 класа — ужо сёння, калі маюць жаданне, могуць лічыць сябе студэнтамі БДУ: за перамогу і прызавыя месцы ў выпускным класе універсітэт падарыў ім права паступаць сюды без уступных экзаменаў.

Пераможцам ва ўсіх класах уручаны таксама членскія білеты геаграфічнага таварыства СССР.

Удзельнікі алімпіяды спаборнічалі ў двух турах — тэарэтычным і практычным. Валерый Станіслававіч АНОШКА, старшыня геаграфічнага таварыства БССР, які ўзначальваў журы алімпіяды, прызнаўся ад імя ўсіх 18 яго членаў, што яны, выкладчыкі універсітэта і педагагічнага інстытута, былі па-добраму здзіўлены высокім ўзроўнем геаграфічных ведаў школьнікаў. Тыя не толькі прадэманстравалі, што добра разбіраюцца ў праблемах навукі, якая ніколі не карысталася сапраўднай пашанай з боку школьнай праграмы, але і самі быццам прывезлі з сабою ўсю шырыню беларускай геаграфіі. Сярод пераможцаў алімпіяды — вучні школ Віцебска і Гомеля, Століна і Чэрвеня, Баранавічаў і Ляхавічаў, Навагрудка і Наваполацка, Карэлічаў і Новалукомля.

Вольга МІХНОВІЧ, пераможца ў 11 класе, вучыцца ў 7-й сярэдняй школе г. Наваполацка. Ці ўбачым мы яе ў будучым верасні сярод студэнтаў БДУ?

— Я такая разгубленая зараз, што пакуль нічога пэўнага сказаць не магу,— прызнаецца Оля.— Шчыра кажу, не чакала сваёй перамогі, думала, што яна дастанецца першаму ў нашай вобласці, дзе я заняла другое месца. Цяпер буду рыхтавацца да ўсесаюзнай алімпіяды, якая пройдзе ў сярэдзіне красавіка ў Керчы. А потым падумаю пра паступленне...

## ПА САКРЭТУ УНІВЕРСІТЭТУ

## СКБ у пошуках СП

Красавік падорыць нашаму гораду «Мінскі кірмаш: вясна-91». Сярод яго ўдзельнікаў — спецыяльнае канструктарска-тэхналагічнае бюро БДУ з вопытнай вытворчасцю.

Госці кірмаша будуць мець магчымасць пазнаёміцца з разнастайнай прадукцыяй СКБ. З індывідуальнымі дазіметрамі, напрыклад, гама-радыёметрамі, рэнтгенаўскім інтраскопам, з дапамогай якога можна паменшыць дозу ад аднаго рэнтгенаўскага абследавання ў 500 разоў — прадукцыяй, так неабходнай сёння Беларусі. Вучоныя бюро не забываюцца і на праблемы прамысловасці. Імі распрацаваны ўстаноўкі высокага ціску для заліўкі малых аб'ёмаў пенапаліурэтана, якія карыстаюцца попытам у радыёэлектроннай, электратэхнічнай і лёгкай прамысловасці, у аўтамабільнай і абутковай вытворчасці.

Сусветнага ўзроўню распрацоўкі і выканання дасягае створаная ў СКБ з ВВ сістэма дыстанцыйнага зандзіравання «Гама-2 віда», якая дазваляе з борта касмічнага апарата атрымліваць унікальную інфармацыю аб геалагічных асаблівасцях і экалагічным стане розных раёнаў Зямлі. Атрыманыя даныя можна аналізаваць непасрэдна ў космасе. Сістэма ўжо добра зарэкамендавала сябе пры правядзенні міжнародных эксперыментаў і можа выкарыстоўвацца не толькі савецкімі арбітальнымі станцыямі.

Супрацоўнікі спецыяльнага канструктарска-тэхналагічнага бюро чакаюць ад кірмаша не толькі сустрэч з пакупнікамі, але і шанцаў для заключэння выгадных дагавароў і кантрактаў і для стварэння сумесных прадпрыемстваў (СП).

## ДАІ ПАВЕДАМЛЯЕ

## Аперацыя «Пешаход»

Шмат змен перажылі мы за першыя месяцы бягучага года. А вось сітуацыі на нашых дарогах гэта не датычыць: лічбы дарожна-транспартных здарэнняў паказваюць, што там ўсё паранейшаму. 110 здарэнняў адбылося на мінскіх вуліцах за студзень і люты, пры гэтым 10 чалавек загінула і 115 паранена. Аднолькава вінаватыя ва ўсіх гэтых выпадках і вадзіцелі, і пешаходы: з-за парушэнняў апошніх загінула 4 чалавекі і паранена 59 у 62 здарэннях.

Як звычайна, у ганебным спісе парушальнікаў правілаў дарожнага руху дастаткова студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ. У новым годзе сярод іх — А. Шчэрбак, студэнт, В. Б. Крашэўскі, выкладчык, І. А. Крывовіч, оптык.

Перш за ўсё для іх, а таксама для ўсіх, хто штодня сутыкаецца з дарожным рухам, нагадваем, што ў красавіку ў Мінску праводзіцца аперацыя «Пешаход».

М. ДЗЕРГАЧОЎ,
дзяржаўтаінспектар ДАІ
Маскоўскага раёна.

## ПРЫЕХАЛІ...

## АСЦЯРОЖНА: МАГІЯ ЛІЧБАЎ

Можна і не верыць у яе — у магію гэту. Але яна ўсё роўна, раней ці пазней, заявіць пра сябе, калі існуе на самой справе.

Здавалася б, што яшчэ можа змяніцца з павышэннем кошту праязных білетаў, акрамя змесціва студэнцкіх кашалькоў? Давайце падумаем. Замест 1,5 рубля ў месяц на адзін від транспарту — тры з паловай, замест 1,9 на два віды — чатыры з паловай і пяць з паловай на ўсе віды на змену 2 рублям і 30 капейкам. Яшчэ раз паглядзіце на гэтыя лічбы. Нібы страчана нешта, акрамя грошай, з-за развітання з ранейшым коштам праезду. Бо лічбы гэтыя — не проста выражэнне цаны, яны частка таго жыцця, якое наўрад ці вернецца ўжо. Былое жыццё наша не карыстаецца ні трамваем, ні аўтобусам ці тралейбусам, ні метро. Яно застаецца дзесьці за намі — усё далей з кожным днём. А можа, наадварот, імкліва памчалася ўперад і яшчэ сустрэне нас на якім-небудзь складаным скрыжаванні?

## СПРАВА Ў ЛІТАРЫ

Нехта пазайздросціць цяпер студэнтам: у будзёныя дні яны могуць плаціць за білет у кінатэатры палову яго звычайнага кошту. Трапілі студэнты, на гэты раз, як і ў большасці дзяржаўных пастаноў і рашэнняў, у адну «кампанію» з інвалідамі і пенсіянерамі — гэта ўжо наўрад ці можна лічыць падставай для зайздрасці. У нечым будучыя спецыялісты з вышэйшай адукацыяй падобныя на пенсіянераў, а яшчэ чымсьці нагадваюць інвалідаў...

«Як даведацца пра час ільготных сеансаў?» — пацікавіліся мы па тэлефоне 20-90-90. «Шукайце ў кінарэкламе літару «л»,— адказалі там.

Шукаем. Трапляецца яна толькі на ранішніх і дзённых сеансах (дарэчы, больш танных, чым вячэрнія). Для пенсіянераў, што і казаць, гэта зручна, але для студэнтаў... Выходзіць, кінапракатчыкі забараняюць юнакам запрашаць дзяўчат у кіно па ільготнаму тарыфу — маўляў, на пачуццях не эканомяць. А палавінны кошт білетаў уведзены для прагульшчыкаў і хворых. Між тым, у некаторых ВНУ ужо трэба плаціць за пропускі практычных заняткаў — вось вам адна кампенсацыя за льготныя сеансы. А вось і другая: некаторыя з іх адначасова... падоўжаныя.

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

## прафсаюзнага камітэта і адміністрацыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна на 1991 год

### Раздзел 1. Агульныя палажэнні

1.1. Гэты калектыўны дагавор пасля папярэдняга абмеркавання ў падраздзяленнях заключаецца паміж калектывам супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта, які прадстаўлены прафсаюзным камітэтам, і адміністрацыяй універсітэта тэрмінам на 1 год з моманту падпісання яго бакамі.

1.2. Калектыўны дагавор заключаецца на падставе дзейнічаючых Законаў СССР «Аб працоўных калектывах» і «Аб дзяржаўным прадпрыемстве (аб'яднанні) СССР», КЗаП БССР і Палажэння аб парадку заключэння працоўнага дагавора, якое зацверджана Прэзідыумам ВЦСПС і Дзяржкампрацай СССР у лістападзе 1987 года і ўстанаўлівае абавязацельствы бакоў па рашэнню вытворчых, эканамічных і сацыяльных задач, што стаяць перад калектывам універсітэта.

1.3. Адміністрацыя ў асобе рэктара універсітэта і прафсаюзны камітэт у асобе старшыні прафкома абавязуюцца забяспечваць бесперапынны кантроль выканання ўсіх умоў дагавора.

1.4. Прамежкавыя справаздачы аб ходзе выканання Калектыўнага дагавора заслухоіваюцца штоквартальна на сумесных пасяджэннях рэктарата і прафкома з запрашэннем адказных і зацікаўленых асоб. Справаздачу аб выніках выканання абавязацельстваў за год адміністрацыя і прафком праводзяць на канферэнцыі працоўнага калектыву.

1.5. Адміністрацыя і прафком абавязуюцца інфармаваць супрацоўнікаў аб усіх прымаемых рашэннях (размеркаванне жылля, аўтамабіляў. фондавага абсталявання, аб прэміраванні і г. д.).

1.6. Палажэнні працоўнага дагавора распаўсюджваюцца на ўсіх членаў калектыву, незалежна ад таго, з'яўляюцца яны членамі прафсаюза ці не.

1.7. Адміністрацыя абавязуецца ў месячны тэрмін пасля падпісання тыражыраваць сапраўдны дагавор і раздаць яго ўсім падраздзяленням, уключаючы кафедры, лабараторыі і г. д.

1.8. Пры невыкананні калектыўнага дагавора, паўторным зрыве тэрмінаў выканання пагадненняў і абавязацельстваў прафком, канферэнцыя працоўнага калектыву разглядаюць пытанне аб адпаведнасці займаемай пасадзе адказнага выканаўцы.

### Раздзел 2. Выкананне плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця універсітэта

2.1. Скараціць план набора студэнтаў з захаваннем штата выкладчыкаў у 1991 г. па ўсіх формах навучання. Вырашыць пытанне аб мэтазгоднасці вячэрняй формы навучання ва універсітэце.

Адк. рэктар
Тэрмін — красавік 1991 г.

2.2. Абавязаць бухгалтэрыю і планава-фінансавы аддзел зрабіць справаздачу перад кіраўнікамі гасдагаворных работ аб выкананні каштарыса накладных выдаткаў на 1991 г.; бухгалтэрыі і ПФА няўхільна выконваць запланаваны на 1991 год каштарыс накладных выдаткаў.

2.3. Аплаціць са сродкаў фонда навукова-тэхнічнага і сацыяльнага развіцця:

— пуцёўкі ў санаторый-прафілакторый на суму 6600 рублёў;

— пуцёўкі ў гразелячэбніцу на суму 510 рублёў;

— дыетхарчаванне на суму 1620 рублёў;

— выдзеліць 40 тыс. рублёў для аплаты набытых супрацоўнікамі самастойна пуцёвак і курсовак (аплата кожнай з разліку 70 працэнтаў яе кошту);

— перавесці на рахунак гарвыканкома 400 тыс. рублёў для будаўніцтва жылля супрацоўнікам універсітэта.

Адк. галоўны бухгалтар,
старшыня прафкома

2. 4. Выплочваць матэрыяльную дапамогу малазабяспечаным сем'ям, якія маюць чатырох і больш дзяцей і даход на аднаго чалавека не перавышае два мінімальныя аклады, адзін раз у год памерам 250 рублёў.

2.5. Выплочваць аднаразовую дапамогу ўсім работнікам:

— пры выхадзе на пенсію памерам месячнага акладу;

— у сувязі са смерцю блізкіх сваякоў памерам 100 рублёў.

2.6. У сувязі з падаражаннем прадуктаў харчавання і лекаў перавесці на рахунак санаторыя-прафілакторыя на паявых пачатках з НДІ ПФП, НДІ ФХП, НДІ ЯП, СКТБ з ВВ, КБСТ з ВВ, вучэбнай гаспадаркі (прапарцыянальна колькасці выкарыстоўваемых пуцёвак) 65520 рублёў на харчаванне і 10920 — на лекі.

Адк. галоўны бухгалтар

2.7. Скласці каштарыс выкарыстання сродкаў фонду сацыяльнай дапамогі студэнтаў, прадугледзеўшы аплату пуцёвак, матэрыяльную дапамогу, заахвочванне актыву.

Адк. галоўны бухгалтар,
старшыня прафкома студэнтаў

### Раздзел 3. Аплата і нарміраванне працы

3.1. Рэктару і прафкому праз вышэйстаячыя арганізацыі звярнуцца ў СМ БССР з прапановай аб неадкладным павышэнні ў два разы тарыфных ставак і акладаў выкладчыкам і супрацоўнікам.

Затым для кампенсацыі страт рэальных даходаў, якія абумоўлены інфляцыяй, ажыццяўляць індэксацыю даходаў у адпаведнасці з законам ад 21.12.1990 года з каэфіцыентам 1:0,7.

Адк. рэктарат, прафком
Тэрмін — 1 квартал 1991 г.

3.2. Аплату працы ажыццяўляць з зацверджанымі стаўкамі і акладамі з 3 да 5 і з 18 да 20 чысла кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі днямі — у дні, папярэднія выхадным.

Забяспечыць атрыманне зарплаты праз ашчадкасы (па заяве) да 12 чысла кожнага месяца.

Выплату стыпендый ажыццяўляць у адпаведнасці з распараджэннямі па факультэтах з 15 да 17 числа кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі днямі — дні, папярэднія ім.

Адк. галоўны бухгалтар,
дэканы факультэтаў.

3.3. За паспяховае выкананне і перавыкананне тэматычнага плана работ выплачваць прэміі на аснове загада, які выдаецца не пазней чым 30 красавіка. Памеры прэмій і спіс прэміраваных узгадняць з прафсаюзнымі арганізацыямі кафедраў, лабараторый, факультэтаў, службаў.

Адк. рэктар,
галоўны бухгалтар

3.4. Устанавіць максімальную мяжу вучэбнай нагрузкі ў 1991—1992 вучэбным годзе ў разліку на аднаго выкладчыка колькасцю 760 гадзін, пры гэтым лекцыйна-практычная нагрузка дацэнтаў і прафесараў павінна быць не менш чым 150 гадзін. Нагрузка, якая перавышае верхнюю мяжу, аплачваецца як пагадзінная.

Адк. рэктар
Тэрмін — II квартал 1991 г.

3.5. Размеркаванне пагадзіннай нагрузкі ў падраздзяленнях узгадняецца з іх прафсаюзнымі бюро.

3.6. Выплату аднаразовай матэрыяльнай дапамогі студэнтам ажыццяўляць па меры паступлення заяў.

Адк. галоўны бухгалтар

3.7. Устанавіць аб'ём аўдыторных вучэбных заняткаў у 1991—1992 вучэбным годзе не больш 36 гадзін у тыдзень.

Адк. дэканы факультэтаў

### Раздзел 4. Падрыхтоўка кадраў і павышэнне кваліфікацыі

4.1. Забяспечыць умовы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў з выкарыстаннем усіх форм навучання, згодна з планамі падраздзяленняў і перспектыўным планам развіцця універсітэта.

Адк. рэктарат, вучэбны
аддзел

4.2. Арганізаваць сумесна з абкомам прафсаюза работнікаў народнай адукацыі і навукі прававы ўсенавуч супрацоўнікаў універсітэта.

Адк. прафком
Тэрмін — II — IV квартал 1991 г.

4.3. Пашыраць навукова-тэхнічную інфармаванасць прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў універсітэта аб навейшых дасягненнях навукі і тэхнікі шляхам арганізацыі выставак у бібліятэцы.

Адк. дырэктар бібліятэкі, АНТІ

4.4. Забяспечыць выпуск заказных манаграфій супрацоўнікаў універсітэта, якія працуюць над доктарскімі дысертацыямі.

Адк. рэктарат

### Раздзел 5. Вытворчая і працоўная дысцыпліна

АДМІНІСТРАЦЫЯ АБАВЯЗУЕЦЦА:

5.1. Правесці аналіз і ўнесці карэктывы ў службовыя інструкцыі з улікам Палажэння аб вышэйшай навучальнай установе СССР.

Адк. кіраўнікі падраздзяленняў

5.2. Распрацаваць і ўстанавіць для ўсіх падраздзяленняў універсітэта рэгламентаваны расклад дня, каб прадугледзець магчымасці прымянення зменнага графіка работы супрацоўнікаў, не звязаных з вучэбным працэсам, і ўскласці абавязкі за абавязковае выкананне гэтых графікаў на працоўныя калектывы.

Адк. аддзел кадраў, рэктарат

ПРАФСАЮЗНЫЯ КАМІТЭТЫ АБАВЯЗУЮЦЦА:

5.3. Забяспечыць шырокую галоснасць і нагляднасць аб мерах заахвочвання за добрую работу і дысцыплінарнага ўздзеяння да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны, грамадскага і ўнутранага парадку.

### Раздзел 6. Ахова працы

АДМІНІСТРАЦЫЯ АБАВЯЗУЕЦЦА:

6.1. Своечасова праводзіць усе віды інструктажаў (уводны, на працоўным, вучэбным месцы, бягучы і няпланавы) па ахове працы і проціпажарнай прафілактыцы.

Адк. аддзел аховы працы,
кіраўнікі падраздзяленняў

6.2. Рэгулярна праводзіць навучанне і праверку ведаў супрацоўнікаў і студэнтаў, якія заняты на работах з павышанай небяспекай.

Адк. аддзел аховы працы,
кіраўнікі падраздзяленняў

6.3. Своечасова забяспечваць супрацоўнікаў універсітэта спецадзеннем, спецабуткам і сродкамі індывідуальнай абароны ў адпаведнасці з існуючымі нормамі і правіламі.

Адк. прарэктар па АГЧ

6.4. Удакладніць пералік падраздзяленняў і пасад работнікаў і студэнтаў, якія заняты ў шкодных умовах працы, забяспечваць кантроль за прадастаўленнем ільгот (дадатковы адпачынак, скарочаны працоўны дзень, ільготна-прафілактычнае харчаванне малако, надбаўкі да службовых акладаў), якія прадугледжаны заканадаўствам.

Адк. аддзел аховы працы
і камісіі НДЧ

6.5. Арганізаваць правядзенне аналіза паветранага асяроддзя ў памяшканнях універсітэта, ацэнку эфектыўнасці работы вентыляцыйных установак, абмеры супраціўлення ізаляцыі, зазямляючых прыстасаванняў, асветленасці працоўных месц і тэмпературнага рэжыму ў лабараторыях, аўдыторыях і іншых памяшканнях, г. зн. прывядзенне памяшканняў у адпаведнасць з дзейнічаючымі санітарнымі нормамі і правіламі.

Адк. аддзел аховы працы,
галоўны інжынер

6.6. Правесці медагляд супрацоўнікаў, якія звязаны са шкоднымі ўмовамі.

Адк. аддзел аховы працы

6.7. Праводзіць цэнтралізаваную праверку сродкаў абароны.

Адк. служба галоўнага энергетыка

6.8. Скараціць да мінімуму колькасць вячэрніх заняткаў для выкладчыкаў-жанчын, якія маюць дзяцей школьнага ўзросту, і выключыць вячэрнія заняткі для жанчын, якія маюць дзяцей дашкольнага ўзросту.

Адк. загадчыкі кафедраў

6.9. Забяспечыць безумоўнае выкананне мерапрыемстваў па ахове працы, якія прадугледжаны Пагадненнем.

Адк. аддзел аховы працы і
інжынерныя службы універсітэта

6.10. Прафсаюзныя камітэты абавязуюцца:

Сістэматычна праводзіць тлумачальную работу сярод супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта па прафілактыцы вытворчага траўматызму і захворванняў.

6.11. Ажыццяўляць кантроль за забеспячэннем тых, хто працуе ў шкодных умовах, спецадзеннем і спецхарчаваннем.

### Раздзел 7. Жыллёва-бытавыя ўмовы

АДМІНІСТРАЦЫЯ І ПРАФСАЮЗНЫЯ КАМІТЭТЫ АБАВЯЗУЮЦЦА:

7.1. Падрыхтаваць дакументацыю на будаўніцтва 120-кватэрнага жылога дома па вул. Варанянскага.

Адк. рэктарат, прафком

7.2. Прадастаўленне жылой плошчы ажыццяўляць у адпаведнасці са спісамі ўліку тых, хто мае патрэбу, і з улікам ільгот, якія ўстаноўлены інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і прыраўнаваным да іх мнагадзетным сем'ям; маці-адзіночкам; хворым (загад № 33 Мінздрава СССР); сем'ям, якія маюць непаўналетніх блізнят. Весці ўлік асоб, якія маюць права на атрыманне жылля на льготных умовах. Выдзеліць гэтай групе да 20 працэнтаў наяўнага фонда. Улічваць патрэбы маладых спецыялістаў.

7.3. Стварыць ініцыятыўную групу па арганізацыі гаражнага кааператыву.

Адк. прафком.

7.4. Аказваць платную дапамогу садоўніцкім таварыствам. Выдзеліць для гэтых мэт з фонда развіцця сумесна з НДІ ПФП, НДІ ФХП, НДІ ЯП, СКТБ з ВВ, КБСТФ з ВВ 30 тыс. рублёў.

Адк. рэктарат, прафком

7.5. Распрацаваць і зацвердзіць на пашыраным Савеце універсітэта палажэнне аб размеркаванні аўтамабіляў.

Адк. рэктарат, прафком

7.6. Дазволіць уключэнне ў лік членаў МЖК супрацоўнікаў універсітэта, якія маюць да 8 кв. метраў жылой плошчы на аднаго члена сям'і.

### Раздзел 8. Сацыяльнае страхаванне і грамадскае харчаванне

АДМІНІСТРАЦЫЯ АБАВЯЗУЕЦЦА:

8.1. Аплачваць камандзіровачныя выдаткі па пражыванню, якія не забяспечаны неабходнымі дакументамі, памерам 4 рублі ў суткі.

8.2. Забяспечыць бесперабойную работу ўсіх пунктаў грамадскага харчавання (сталовыя, буфеты, кафэ) універсітэта. Дабівацца паляпшэння якасці прыгатавання ежы. А таксама:

а) арганізаваць двухзменную работу буфета на філалагічным факультэце,

б) забяспечваць транспартам сталовыя №№ 33, 34 і стол заказаў,

в) арганізаваць гандаль кулінарнымі вырабамі і паўфабрыкатамі праз буфет біяфака.

8.3. Забяспечыць парадак у абедзенных залах з мэтай захавання санітарна-гігіенічных норм.

ПРАФСАЮЗНЫЯ КАМІТЭТЫ АБАВЯЗУЮЦЦА:

8.4. Арганізаваць сістэматычную работу стала заказаў для выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

8.5. Ажыццяўляць рэгулярны грамадскі кантроль за работай сталовых і буфетаў універсітэта супрацоўнікамі і студэнтамі, якія працуюць, вучацца і пражываюць у адпаведных карпусах, з мэтай паляпшэння якасці харчавання і пашырэння асартыменту.

8.6. Забяспечваць дзяцей супрацоўнікаў універсітэта пуцёўкамі ў піянерскія лагеры.

8.7. Забяспечваць работнікаў і студэнтаў універсітэта льготнымі пуцёўкамі ў санаторыі, дамы адпачынку, пансіянаты, на дыетхарчаванне. Сумесна з рэктаратам набываць дадатковыя пуцёўку на лячэнне і адпачынак за кошт фонда сацыяльнага развіцця універсітэта (п. 2.5 дагавора).

АДМІНІСТРАЦЫЯ І ПРАФСАЮЗНЫЯ КАМІТЭТЫ АБАВЯЗУЮЦЦА:

8.8. Аказваць супрацоўнікам і студэнтам бязвыплатную матэрыяльную дапамогу (з фондаў сацыяльнай дапамогі рэктарата і прафкомаў).

8.9. Аказваць разавую лячэбную дапамогу супрацоўнікам з фонда эканоміі заработнай платы.

8.10. Прадастаўляць супрацоўнікам універсітэта часткова аплачваемы адпачынак па догляду за дзіцем да дасягнення ім трохгадовага ўзросту памерам мінімальнага заробку. Выплату дзяржаўнай дапамогі рабіць з улікам сумы штомесячнай дапамогі, якая выплачваецца на дзіця памерам мінімальнага заробку.

8.11. Усім жанчынам, па жаданню, прадастаўляць штомесячна адзін неаплачваемы вольны ад работы дзень.

### Раздзел 9. Культурна-выхаваўчая і спартыўна-масавая работа

9.1. Забяспечыць фінансаванне груп «Здароўе» ў адпаведнасці з каштарысам работы прафкома.

Адк. прафком

9.2. Аказваць падраздзяленням дапамогу ў арганізацыі экскурсійных паездак па гістарычных і культурных цэнтрах краіны, асабліва ў час адпачынку.

9.3. Арганізаваць цэнтралізаванае забеспячэнне білетамі на канцэрты, у кіно і тэатры.

9.4. Арганізоўваць урачыстыя вечары, прысвечаныя знамянальным датам, тэматычныя вечары, творчыя справаздачы народных калектываў, выстаўкі народнай творчасці.

9.5. Арганізаваць урачыстыя мерапрыемствы з выпадку 70-годдзя універсітэта.

Адк. рэктарат, прафком

### Раздзел 10. Медыцынскае абслугоўванне, адпачынак і санаторна-курортнае лячэнне

10.1. Выйсці з хадайніцтвам у Мінздраў аб арганізацыі універсітэцкай паліклінікі.

Адк. рэктарат
Тэрмін — III квартал 1991 г.

10.2. Правесці на базе паліклінікі універсітэта і прафілакторыя медыцынскі агляд супрацоўнікаў па іх жаданню.

Адк. рэктарат
Тэрмін — IV квартал 1991 г.

10.3. Прадаставіць для адпачынку супрацоўнікаў БДУ Вілейскую вучэбную базу ў вольны ад вучэбнай практыкі час.

Адк. рэктарат, прафком
Тэрмін — ліпень, жнівень, верасень

10.4. Забяспечыць правядзенне адпачынку выкладчыкаў і супрацоўнікаў і канікул студэнтаў шляхам прадастаўлення пуцёвак на:

а) санаторна-курортнае лячэнне,

б) адпачынак у спартыўна-аздараўленчым лагеры,

в) адпачынак па пуцёўках міжнароднага турызму,

г) адпачынак дзяцей супрацоўнікаў і студэнтаў у дзіцячых піянерскіх лагерах.

10.5. Аказваць дапамогу тым, хто мае патрэбу, з фонда прафкома памерам 10—12 працэнтаў ад агульных сум прафсаюзнага бюджэта.

**ВЫ ЧУЛІ?**

# Застолле з «неапазнанымі аб'ектамі», або Яшчэ раз пра навуку харчавання

**Прапануючы вам вытрымкі з апублікаванага ў французскім часопісе «Пуэн» інтэрв'ю з супрацоўнікам Нацыянальнага цэнтра сацыялагічных даследаванняў Клодам ФІШЛЕРАМ, мы разумеем, што ў заходніх гурманаў свае праблемы. Аднак сёе-тое з «рацыянальнага зерня» ў меркаваннях французскага сацыёлага ўпаўне можа прыжыцца і на нашай глебе.**

**— Традыцыйны біфштэкс з салатай выйшаў зараз з моды, французы ў масе адышлі ад спажывання ялавічыны, што нават адлюстравалася на жывёлагадоўлі краіны. Ці не тлумачыцца гэта, на ваш погляд, зніжэннем спажывецкай здольнасці?**

— Не. Тут праглядваецца глыбокая перамена ў адносінах да харчавання. Ад колькаснага падыходу людзі перайшлі да якаснага, ад боязі недаядання — да асцярогі харчавацца няправільна. На працягу многіх дзесяцігоддзяў спажыванне мяса расло разам з узроўнем жыцця, яго нават можна было разглядаць як пэўнага роду барометр эканамічнага росту. Зараз гэта ўжо не так.

**— Ці датычыць гэта толькі мяса?**

— Спажыванне мяса стала зніжацца — у параўнанні, напрыклад, са спажываннем хлеба — адносна позна. У канцы XIX стагоддзя кожны чалавек ужываў у сярэднім 811 грамаў хлеба ў дзень. Зараз — толькі 170 грамаў.

**— Чаму?**

— На працягу многіх стагоддзяў хлеб з'яўляўся базавым прадуктам. Не з'еў хлеба — нібыта і не сыты. Без хлеба ўзнікала адчуванне недаядання. Зараз ён разглядаецца як дапаўненне, гэта значыць стаў адным з відаў харчавання сярод многіх. Адносіны да ежы эвалюцыяніруюць разам з грамадствам. Раней людзі «зараблялі сабе на хлеб». Пазней узнік выраз «зарабляць свой кавалак мяса». Магчыма, хутка стануць гаварыць: «зарабляць свой паштэт з крабаў»? Мы канстатуем пераразмеркаванне харчовых ролей і змяненне значэння, якое надаецца прадуктам.

**— Ці быў адыход ад мяса рэзкім і нечаканым?**

— Ён адбыўся паступова. У 50-х—70-х гадах урачы прапісвалі біфштэкс як сродак ад сардэчна-сасудзістых захворванняў. Мяса здавалася тады гарантыяй здароўя, стравай для мужчын — і для фізічнага работніка, і для спартсмена. Перамена адбылася ў два этапы. Спачатку ўзнікла думка, што мяса не з'яўляецца неабходным. Зразумела, шкодным яго яшчэ не называлі, але ранейшая думка ўжо змянілася. Зараз «пажадлівасць» усё больш выцясняецца вегетарыянствам. Мы яшчэ не зраўняліся са Злучанымі Штатамі, дзе ствараецца сапраўдная непрыязнасць да мяса. Там у некаторых рэстаранах заказаць біфштэкс амаль гэтак жа недарэчы, як выкурыць у грамадскіх месцах пачак цыгарэт. І гэта яшчэ мякка сказана...

**— Ці ёсць іншыя прычыны для змянення «харчовага статута» мяса?**



— Мяса — прадукт жывёлагадоўлі, а нашы адносіны да жывёл істотна змяніліся. Дарвін, этолагі — напрыклад, Конрад Лоранц — навучылі нас бачыць сувязь паміж жывёлінамі і чалавекам. Жывёлы «ачалавечыліся». У іх ёсць грамадства, паводзіны, культура; яны хіба толькі што не гавораць.

**— Як жа выходзіць са становішча «чалавек усёядны»?**

— З дапамогай кулінарыі. Гэта спосаб падаць новае пад «знаёмым соусам». Кулінарыя здольна таксама змяніць манатоннае харчаванне, ствараючы ўражанне разнастайнасці. Ні адно грамадства не ўжывае ўсяго, што з'яўляецца ў яго акружэнні патэнцыянальна прыдатным да ежы. Але ж віды, што лічацца невядомымі, неабавязкова біялагічна таксічныя. Мы не ядзім насякомых, таму што ў нашым грамадстве яны з'яўляюцца прадметам агіды. Панцыр тут ні пры чым — аплятаем жа мы ракападобных... А на самой справе пратэін насякомых амаль нічым не адрозніваецца ад ялавічыны.

На думку некаторых антраполагаў, харчовыя табу распаўсюджваюцца на жывёл, якія дрэнна ўпісваюцца ў класіфікацыю. Напрыклад, у некаторых грамадствах непрыгоднымі да ежы лічацца лятучыя мышы — яны пакрыты поўнасцю, у той час як усе лятаючыя маюць пер'е; вугры — плаваюць, але не маюць лускі, як рыбы; змеі — перасоўваюцца па сушы без ног.

**— У адрозненне ад велізарнай большасці насельніцтва свету, у Францыі няма праблем з недахопам харчавання. Тым не менш ніколі не гаварылі так многа тут пра кухню, пра харчаванне. Што ж адбываецца?**

— З пачатку 60-х гадоў гандаль прадстаўляе пакупніку шырокі асартымент прадуктаў. Патрэбна рабіць выбар. Чым менш упэўнена адчувае чалавек сябе ля паліцы, тым больш вакол жадаючых даваць — або прадаваць — яму парады. Прычым часта супярэчлівыя. І гэта натуральна: развіццё харчовай прамысловасці прывяло да таго, што мы не маем дакладнага ўяўлення аб тым, што ядзім. «Ці ведаем мы, што ядзім?» — пад такім загалоўкам часопісы 70-х гадоў разглядалі праблему фарбавальнікаў, дабавак і г. д. Мы відавочна ўсё больш і больш ужываем «неапазнаных ядомых аб'ектаў».

**— У харчовым хаосе ўзнікае і боязь распаўнець. Але ж так было не заўсёды...**

— Зусім да нядаўняга часу паўната ўспрымалася як прыкмета добрага здароўя! Лічылася, што ў такога арганізму ёсць рэзервы. Пазней амерыканскія страхавыя кампаніі ўзяліся за пошукі індыкатара пры аналізе «рызыкі» ў страхаванні жыцця, устанавілі карэляцыю паміж вагой і смяротнасцю і вырашылі што адно залежыць ад другога. Яны стварылі табліцы ідэальнай вагі ў залежнасці ад росту. Пазней медыкі гэтыя табліцы шырока крытыкавалі і ўносілі ў іх папраўкі Але, як бы там ні было, паўнату ўжо ніхто не разглядае як рахунак у надзейным банку. Наадварот гэта нешта непатрэбнае, нават шкоднае. А паколькі за любымі разважаннямі аб харчаванні стаіць заўсёды маральнае меркаванне, гігіеніст аказваецца перш за ўсё маралістам. Вось і лічыцца, што таўсцяк есць больш, чым выпадае на яго долю...

**— А жанчыны?**

— У 60-х гадах адмоўныя адносіны да паўнаты, быўшыя да гэтага справай мужчын, перакінуліся і на жанчын. У імя здароўя яны селі на дыету. Аднак эвалюцыя дала жаночаму арганізму здольнасць назапашваць тлушч, каб павысіць здольнасць да зачацця. Так, згодна з нядаўнімі даследаваннямі, першая менструацыя пачынаецца ў дзяўчат толькі тады, калі ўтрыманне тлушчу ў іх арганізме дасягае 22 працэнтаў. У час масавага голаду менструацыя ў жанчын спыняецца, зніжаецца здольнасць да зачацця.

Эвалюцыя нораваў прывяла, аднак, да таго, што сённяшняя жанчына не столькі аднаўляе чалавечы род, колькі што-небудзь вырабляе. Таму нашых сяброўак хвалюе не столькі ўласнае здароўе, колькі знешні выгляд. Я сказаў бы нават, што яны гатовы дзеля адпаведнасці моднаму зараз юнацкаму вобліку паставіць сваё здароўе пад пагрозу. У модзе не класічныя формы, а вытанчанасць. Дыеталогія зближаецца па ролі з касметалогіяй. На гэтым і грунтуецца, напрыклад, мода на абястлушчаныя прадукты. Заклікі да ўжывання меншай колькасці тлушчу прыводзяць да небяспечных відаў дыеты, якія часам выклікаюць поўнае знясіленне.

**— У харчаванні часам бачаць прычыну і такіх «хвароб веку», як анкалагічныя і сардэчна-сасудзістыя...**

— Усе лічаць, што быць поўным і есці тлустую ежу шкодна для здароўя. Іншымі словамі, што чалавек уласнымі зубамі рые сабе магілу. Як толькі мы пачынаем шукаць тлумачэнне якому-небудзь злу, першае, што прыходзіць у галаву, — харчаванне. Не пазбеглі гэтага і ўрачы. Замест таго, каб разглядаць усе магчымыя карэляцыі паміж тлушчам, халестэрынам і сардэчна-сасудзістымі захворваннямі, паміж харчаваннем і ракам. Такія, напрыклад, справы з карэляцыяй паміж харчаваннем, багатым тлушчам і бедным валокнамі, і ракам. Яна існуе, але прычынная сувязь фармальна не даказана. Сцвярджаць наяўнасць такой сувязі, гэта ўсё роўна, што заяўляць, быццам у Нью-Йёрку, горадзе небаскробаў, жанчыны менавіта таму носяць больш мініспадніц, чым на Сярэднім Захадзе.

**— Дык усё ж звязаны гэтыя «хваробы цывілізацыі» з тыпам харчавання ці не?**

— Часткова так. Але харчаванне досыта падвяргае перш за ўсё рызыцы дажыць да старасці. А чым больш мы жывём, тым больш у нас шанцаў і атрымаць сардэчна-сасудзістае ці анкалагічнае захворванне. Таму што, як правіла, такія хваробы праяўляюцца не ў 25—30 гадоў. Самым небяспечным для здароўя сучаснага «чалавека ўсёеднага» з'яўляецца і павелічэнне працягласці яго жыцця.

**САКРЭТ ФІРМЫ**

## Дзве прыступкі наверх?

На мехмаце Маскоўскага універсітэта ўжо некалькі месяцаў ідуць спрэчкі аб пераходзе на так званую «двухступеньчатую сістэму навучання», якая можа дапамагчы пазбавіцца ад «вечных студэнтаў». Сутнасць гэтай сістэмы ў тым, што студэнт пасля чатырох гадоў вучобы ў ВНУ лічыцца выпускніком і можа самастойна шукаць работу па сваёй спецыяльнасці. А жадаючыя могуць вучыцца яшчэ два гады. Невядома толькі, ці здолее адзін факультэт пабудаваць дастатковыя падставы для пераходу да такіх форм зносін паміж прадпрыемствамі і ВНУ.

## На заняткі — з лыжкай

Не абышла і сталоўкі Краснаярскага універсітэта агульная праблема нашага грамадскага харчавання: тут стала не хапаць і талерак, і лыжак, і відэльцаў. Студэнтам прапануецца хадзіць на абед з персанальнымі лыжкамі і відэльцамі, а ўсім забяспечаным посудам супрацоўнікам і навучэнцам — дапамагчы універсітэцкай сталовай.

## 250 рублёў — таксама стыпендыя

Пры прэзідыуме АН Казахстана створаны рэспубліканскі фонд падтрымкі творчых ініцыятыў маладых вучоных. Усе маладыя людзі гэтай рэспублікі, якія маюць цікавыя навуковыя ідэі ці праекты і ведаюць шляхі іх рэалізацыі, могуць разлічваць на падтрымку фонда. Саветам Міністраў Казахскай ССР зацверджана стыпендыя памерам 250 рублёў для аспірантаў АН і Міністэрства народнай адукацыі рэспублікі і стыпендыі, якія носяць імёны вядомых людзей, памерам 200 рублёў.

# Студыён

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

### ДВА З ДЗЕСЯЦІ

Ці памятае такое гісторыя спорту? На прадстаўнічым Міжнародным турніры па грэка-рымскай барацьбе, які праходзіў у Будапешце, у саставе зборнай краіны двое з дзесяці — барцы нашага універсітэта. Гэта пераможца Алімпіяды ў Сеуле, неадназаразовы чэмпіён свету, выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Камандар Маджыдаў і чэмпіён свету, трэцякурснік юрыдычнага факультэта Сяргей Дземяшкевіч.

Абодва спартсмены падняліся на вышэйшую прыступку п'едэсталу гонару: Камандару не было роўных у вазе да 68 кг, а Сяргей аказаўся мацнейшым у вагавай катэгорыі да 100 кг.

### УСТУПІЛІ «ПРАФЕСІЯНАЛАМ»

Чаканне крыху зацягнулася — у мінулым годзе так і не ўдалося правесці лыжныя спаборніцтвы. Але аматары гэтага віду спорту аказаліся надзвычай цярплівымі. Яны не трацілі час дарэмна. Калі выпадаў снег, трэніраваліся ў сябе дома, не было яго — таксама не падалі духам, выязджалі ў Мурманск. Не дарэмна: на Спартакіядзе рэспублікі па лыжнаму спорту зборная БДУ стала сярэбраным прызёрам, уступіўшы толькі «прафесіяналам» — камандзе інстытута фізічнай культуры.

### КАРАЛЕВА ЗЛІТАСЦІВІЛАСЯ...

«Так-так, нельга крыўдзіцца на каралеву спорту — лёгкую атлетыку», — лічыць трэнер універсітэцкай зборнай М. А. Жаўнерка. Другое месца ў першынстве Беларусі сярод ВНУ ў закрытых памяшканнях — вынік нядрэнны.

## БЯГУЧЫМ РАДКОМ

# У накаут!

*Самым юным чэмпіёнам свегу сярод баксёраў (першая паўсярэдняя катэгорыя) да гэтага часу лічыцца Уілфрэд Бенітэз (Пуэрта-Рыка). Калі ён перамог у рашучым паядынку, яму было 17 гадоў і 176 дзён.*

*А вось Арчы Мур заваяваў гэты тытул (у паўцяжкай вазе), калі яму споўнілася 48 гадоў.*

*Боб Фітцсменс на працягу 30 гадоў (!) — з 1883 да 1914 — выступаў на баксёрскім рынгу. Свой апошні бой за тытул чэмпіёна свету 42-гадовы Боб праваў у 1905 годзе.*

*Самы працяглы бой паміж баксёрамі лёгкай вагі амерыканцам Джо Хансам і Оскарам Нельсанам (Данія) адбыўся 3 верасня 1906 года ў Невадзе (ЗША). Паядынак закончыўся на 42-м раундзе перамогай Ханса.*

*Рэкордную колькасць баёў за тытул чэмпіёна свету — (37!) — правёў амерыканец Джэк Брытэн. Настойлівасць спартсмена тройчы заканчвалася поспехам — у перыяд з 1915 да 1922 года.*

*Чэмпіёнам свету ў трох вагавых катэгорыях (паслядоўна ў паўлёгкай, лёгкай і другой паўсярэдняй) станавіўся ў перыяд са жніўня да снежня 1938 года амерыканец Хенры Армстронг.*

*Зараз былы баксёр стаў свяшчэннаслужыцелем і носіць імя Хенры Джэнсан.*

*Сустрэчай гігантаў назвалі бой на рынгу ў Аклахамасіці (ЗША) ў 1971 годзе. Паядынак вялі Клод Майкбрайд з Хемпфры (яго вага 154 кг) і Джымі Бляк (163 кг).*

## НА АЛІМП!

# МУДРАСЦЬ — МАЛАДОСЦІ ПАДМОГА

ДЛЯ ДАВЕДКІ: Сяргей Дземяшкевіч, майстар спорту міжнароднага класа. Уладальнік Кубка свету 1988 года, бронзавы прызёр чэмпіянату краіны гэтага ж года, чэмпіён свету — 90 па класічнай барацьбе. Студэнт-трэцякурснік юрыдычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Нарадзіўся ў 1966 годзе.

— Гэта люстэрка і сёння стаіць у спортзале школы алімпійскага рэзерву Мінабласвета ДФСТП,— дзеліцца ўспамінамі першы спартыўны настаўнік Сяргея заслужаны трэнер БССР Уладзімір Аляксандравіч МЯДЗВЕДЗЕЎ.— Упэўнены, што бачачы сваё адлюстраванне — у чым толькі душа трымалася,— дзесяцігадовы хлопчык наўрад ці ўяўляў сябе ў будучым чэмпіёнам свету.

Шчыра кажучы, я і сам не ведаў, як з трыццацікілаграмовага незайздроснага хлапчука выхаваць атлета пад цэнгнер вагой. Ды і крыўдлівым ён аказаўся крыху не да. слёз...

Але, як гаворыцца, ліхая бяда пачатак. Прычым, у шматлікіх юнацкіх турнірах Дземяшкевіч быў, мякка кажучы, незаўважны.

Не сакрэт, што, як і ў іншых відах спорту, у барацьбе зараз існуюць своеасаблівыя трэнерскія канвееры. Мінскі ўпэўнена перапраўвіў Сяргея да «варот» зборнай краіны.

Старшы трэнер каманды СССР Г. А. Сапуноў звярнуў увагу на Дземяшкевіча пасля яго «бронзавага» поспеху на чэмпіянаце краіны ў 1988 годзе. Але на наступны год на чэмпіянаце свету мінчанін быў толькі пятым у вазе да 90 кілаграмаў. І тут настаўнікі галоўнай каманды Саюза рызыкнулі, даверыўшы Сяргею абараняць гонар краіны на сусветным першынстве-90. Але ў катэгорыі на... дзесяць кілаграмаў вышэй. І Дземяшкевіч у Італіі не падвёў, апраўдаў давер настаўнікаў.

Чым ён «бярэ» сапернікаў? Напэўна, уменнем імгненна вызначаць слабыя і моцныя бакі свайго «візаві», грунтоўнай падрыхтоўкай. У гутарцы Сяргей — сама разважлівасць. Магчыма, таму і выбраў нялёгкі юрыдычны факультэт. І яшчэ дэталь — адчуў, што справы на два франты не ідуць: адразу ўзяў акадэмічны адпачынак. А вось зараз, калі крыху спала напружанне, настойліва рыхтуецца да летняй экзаменацыйнай сесіі. Не дазваляе характар чэмпіёну свету чакаць скідак.

З НАВАГОДНЯГА ІНТЭРВ'Ю. «Зразумела, 1990 год запомніцца добрай перамогай. Зараз важна замацавацца ў складзе галоўнай каманды краіны. 1991-ы — год перадалімпійскі. Таму проста неабходна прайсці яго роўна, каб заваяваць пуцёўку ў Барселону».

Выдатна пачаў Сяргей і барцоўскі сезон-91. У пачатку года на міжнародным турніры памяці Івана Паддубнага ў Растове-на-Доне яму не было роўных у катэгорыі да 100 кілаграмаў.

— Я рады перамозе яшчэ і таму,— сказаў атлет,— што гэта быў мой дэбют у гэтай вагавай катэгорыі. Важна добра пачаць, таму што першы адборачны этап — гэта своеасаблівая запеўка на ўвесь сезон...

Сярод асноўных сапернікаў Сяргей вылучае моцных грузінскіх барцоў Тададзе і Мдзіхаіры, растаўчаніна Шафалава. Упэўнены мінчанін, што не сказаў свайго апошняга слова і гродзенскі барэц, вопытны Анатоль Федарэнка. Дарэчы, Толя таксама пачынаў займацца ў Мінску і хто ведае, ці не сойдуцца ў фінале аднаго з турніраў землякі?!

Як, напэўна, усякі вялікі спартсмен, Дземяшкевіч вельмі марыць перамагчы на Алімпіядзе-92. Хоць зрабіць гэта будзе вельмі няпроста: спартыўнае жыццё часта проста непрадказальнае, планаваць вынік цяжка. Тым больш, што восенню трэнеры зборнай краіны, бачачы некаторую стомленасць сярод спартсмена, прапаноўвалі прапусціць чэмпіянат Еўропы.

Ці не стаміўся Дземяшкевіч ад такога імклівага жыцця «спадарожніка» з яго вечнымі зборамі, паездкамі, спаборніцтвамі? Дзе бярэ сілы?

— Зразумела, дома,— стомлена ўсміхаецца Сяргей.— Дзе б ні знаходзіўся, пастаянна цягне да родных, блізкіх. Я люблю родны Мінск. Тут у мяне шмат сяброў, таму і аднаўляю псіхалагічную і эмацыянальную энергію тут, у коле блізкіх людзей. Што ж датычыць інтарэсаў, захапленняў, то яны падобныя да тых, што ў маіх равеснікаў.

Заўважу, што класічнай барацьбой займаецца і 18-гадовы брат Сяргея — Уладзімір. Ён — студэнт Мінскага інстытута культуры. Цікавае выказванне старэйшага пра малодшага: «Пра поспехі, безумоўна, гаварыць рана. Але імпануе тое, што трэніруецца брат старанна. Апошнім часам на яго звярнулі ўвагу трэнеры зборнай рэспублікі. Я чакае ўдзел у цэлай серыі маладзёжных турніраў. Перспектыва ёсць, але ўсё залежыць у першую чаргу ад яго самога».

Галоўнае, што Дземяшкевіч цэніць у людзях,— прыстойнасць. Ёсць яна — і чалавек не зможа зрабіць зло. Значыць, узнікае і зваротная чалавечая сувязь.

Наогул, паважлівыя адносіны да саперніка ў Сяргея ў крыві. Наш малады чэмпіён свету прабіваўся ў эліту доўга і няпроста. Але, навучыўшыся быць цярплівым у маладосці, ён стаў мудрэйшым цяпер.

**В. ФІЛІПЧЫК.**

## ПІНГ-ПОНГ

# У СПОРТА — АЛІБІ

Ці падвяргаюць сябе небяспецы «падхапіць» СНІД спартсмены?

**В. ГЛУШАКОЎ,** студэнт.

З дапамогай урача Віктара Адамавіча ДАШКЕВІЧА нам удалося высветліць, што ўрачамі пакуль не зарэгістравана ніводнага выпадку прафесійнага СНІДа ў спартсменаў — хвараюць толькі тыя з іх, хто заразіўся ў выніку сексуальных паводзін ці ўжывання наркотыкаў. Праўда, што сліна і сакрэт потавых залоз утрымліваюць вірус СНІДа. Але канцэнтрацыя яго не такая ўжо высокая, таму заражэнне другога чалавека ў час спартыўных кантактаў адбыцца практычна не можа. Ні праз паветра спартыўнай залы, ні праз ваду басейна, ні праз спартыўныя снарады ВІЧ не перадаецца.

## АПОШНЯЯ СПРОБА

# Даеш гармонію душы і цела!

***Пасля чарговай прабежкі (не трусцой, а рыссю) па магазінах мала хто можа застацца ў нармальным псіхалагічным стане. Звычайна наступае пачуццё поўнай душэўнай дэпрэсіі і абыякавасці. Не так проста выкараскацца з такой «бязважкасці». Каб вяртанне да сябе было хутчэйшым, старайцеся не заставацца сам-насам з сабой. Паспрабуйце знайсці субяседніка, яшчэ лепш — аднадумцу.***

Відаць, вы ўжо здагадаліся, што самы надзейны спосаб самадапамогі — спорт. Ён адначае не толькі фізічныя страты, але і маральныя.

Многія з вас, напэўна, чулі, што ва універсітэце створаны і паспяхова дзейнічае Усходні клуб адзінаборстваў. Чаму менавіта гэтыя віды барацьбы, якія не так даўно былі ў апале, так шпарка ўварваліся ў наша жыццё? Адказ, на маю думку, просты: тут духоўнае і фізічнае ўдасканаленне — непадзельныя. Гэта — адно цэлае. Менавіта тое, што нам сёння так неабходна.

У адным з інтэрв'ю выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Л. З. Левіт, які вядзе групу ёгі, запэўніў: «Зусім не абавязкова імкнуцца пасля некалькіх заняткаў легчы на шкло ці цвікі. Галоўнае для нас— зносіны. Стараемся, каб людзі не ўдаляліся ў ёгаўскі індывідуалізм, а імкнуліся слухаць адзін аднаго».

Тыя, хто наведвае групу, не толькі займаюцца практычна. Яны вывучаюць тэорыю, зацікаўлена абмяркоўваюць пытанні, звязаныя з псіхалогіяй чалавечых зносін, самарэгуляцыяй. Ці не гэтага так не стае кожнаму ў наш разбалансаваны эканамічна і палітычна час. Навучыцеся валодаць сабой, успомніце пра тое, што вы — «гома сапіенс», азірніцеся навокал і... ўсміхніцеся. Вы адчуеце, што жыццё цудоўнае і вакол вас такія ж цудоўныя людзі.

Але каб такі цуд адбыўся, трэба навучыцца валодаць сабой, настройваць сябе на пэўны (вядома, аптымістычны) лад. Паспрабуйце апошні шанс — ва Усходнім клубе адзінаборстваў вам дапамогуць (ва ўсялякім выпадку паспрабуюць) знайсці пачуццё гармоніі з навакольным светам.





А ВЫ ЗМАГЛІ Б?

Фота С. ВАСІЛЬЕВА.

# Рабі — раз...

Хто б мог падумаць, што значэнне пазваночніка ў самаадчуванні чалавека наўрад ці менш важнае, чым правільнае дыханне і харчаванне. Але гэта так. «Няспраўнасць» яго можа прывесці да розных захворванняў сэрца, жоўцевага пузыра, страўніка, кішэчніка...

Асаблівасці дэфектыўнай будовы пазваночніка змяніць амаль немагчыма, таму застаюцца толькі прафілактычныя меры.

А зараз — рабіце, як мы (усе практыкаванні паўтараць аднолькавую колькасць разоў у кожны бок, дыханне — праз нос).

1. Пры любой рабоце трэба час ад часу ўстаць, устойліва расставіць ногі і адхіліць галаву назад. Не спяшаючыся павярнуць яе да ўпору ўправа, затым улева. Пакруціць ёю ў розныя бакі ў адхіленым назад становішчы.

2. Стоячы з адхіленай галавой, падняць напаўсагнутыя ў локцях рукі і прагнуцца назад 3—5 разоў. Дыханне не затрымліваць.

3. Такое ж прагнанне, але з адстаўленнем спачатку правай нагі, потым — левай. Па 6—8 разоў.

4. Ногі на шырыне плячэй, рукі сагнуць у лакцях і падняць на ўзровень грудзей. Галава і таз застаюцца ў становішчы «прама». Паварот плячэй пояса ўправа — выдых, вяртанне ў зыходнае становішча — удох, паварот налева — выдых. Па 6—10 разоў. Пасля некаторай трэніроўкі можна на час павароту плячэй пояса ў адзін бок крыху паварочваць галаву ў супрацьлеглы.

5. Ногі паставіць шырэй, рукі на бёдрах. Нахіл управа — выдых. Правая рука слізгаецца па бядры ўніз — левая рука слізгаецца па баку ўверх (рукі быццам дапамагаюць «даваранць» плечы так, каб левы бок цела атрымаў большае расцяжэнне пры нахіле ўправа і наадварот). Вяртанне — удых. Нахіл улева — выдых. Па 6—8 разоў.

6. Ногі шырока, рукі на бёдрах. Кручэнне тазам па гадзіннікавай стрэлцы, затым супраць яе. Па 7—14 разоў. Дыханне свабоднае.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

4 красавіка

Зак. 2060.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОЙ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.